УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
ІМЯ МАКСІМА ТАНКА»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар
____________________ А.І.Жук
«__26__» ____________ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД-31-1-89/2024/вуч.

# МЕТАДЫКА НАПІСАННЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Вучэбная праграма ўстановы адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя**
**(Беларуская мова і літаратура)**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі, зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбнага плану па спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура), зацверджанага 23.02.2023, рэг. № 048 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
І.М.Мішчанчук, загадчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
М.С.Рак, выкладчык кафедры беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
Г.К.Тычко, прафесар кафедры перыядычнага друку і вэб-журналістыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт», доктар філалагічных навук, прафесар;
А.І.Жышкевіч, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар
ДУА «Сярэдняя школа № 191 г. Мінска» ____________ Ю.І.Пінчук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай беларускай і замежнай літаратуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 3 от 29.10.2024 г.)

Загадчык кафедры ______________ І.М.Мішчанчук

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 2 ад 24.12 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых
яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства
адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура).

Вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» садзейнічае правядзенню навукова-даследчай работы студэнтаў, якая ажыццяўляецца на працягу ўсяго перыяду навучання, і паспяховаму напісанню курсавой і дыпломнай работ.

Вучэбная дысцыпліна «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» носіць практыка-арыентаваны і кампетэнтнасны характар і садзейнічае фарміраванню ў студэнтаў самастойнасці меркаванняў, вучыць выказваць і адстойваць уласныя погляды і думкі, аргументаваць іх, абапіраючыся на канкрэтныя навуковыя факты.

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» – фарміраванне на аснове кампетэнтнаснага падыходу сістэмы ведаў, уменняў і навыкаў, неабходных для ажыццяўлення навукова-даследчай работы, а таксама навуковай камунікацыі і публічнай прэзентацыі вынікаў навукова-даследчай дзейнасці на розных яе этапах у сферы філалагічнай адукацыі.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– даць студэнтам рознабаковыя веды па прадмеце;

– фарміраваць агульныя даследчыя ўменні і навыкі (выяўленне і пастаноўка праблемы; фармуляванне гіпотэзы; планаванне і распрацоўка гіпотэзы даследчых дзеянняў; збор інфармацыі; аналіз і сінтэз сабранай інфармацыі; пераасэнсаванне вынікаў даследавання падчас адказаў на пытанні; фармуляванне высноў і г.д.);

– пазнаёміць студэнтаў з прыярытэтнымі напрамкамі літаратуразнаўчых даследаванняў і аказаць дапамогу пры напісанні дыпломных работ;

– фарміраваць навыкі падрыхтоўкі і правядзення навуковых даследаванняў, напісання навуковых работ, артыкулаў, курсавых і дыпломных работ, падрыхтоўкі прэзентацый;

– выпрацаваць навыкі вядзення навуковай дыскусіі і прэзентацыі даследчых вынікаў на навуковых мерапрыемствах, абмеркавання актуальных праблем літаратуразнаўства;

– фарміраваць уменні і навыкі прафесійнага літаратуразнаўчага аналізу твораў мастацкай літаратуры.

***Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.***

Вучэбная дысцыпліна «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» адносіцца да модулю «Тэарэтычныя і прыкладныя

аспекты літаратуразнаўства» і ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі. Вучэбная дысцыпліна «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» звязана з вучэбнай дысцыплінай «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – XX сагоддзяў», якая ўваходзіць у дзяржаўны кампанент і абапіраецца на паняцці, атрыманыя падчас вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў літаратуразнаўства», якая ўваходзіць у кампанент установы вышэйшай адукацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

***ведаць***:

– тэарэтычныя асновы і базавыя паняцці сучасных навуковых літаратуразнаўчых даследаванняў;

– асноўныя паняцці, звязаныя з навукова-даследчай дзейнасцю (яе сутнасцю, асаблівасцямі арганізацыі, спецыфікай афармлення і прадстаўлення вынікаў і г.д.);

– існуючыя метады даследавання, у тым ліку метады збору эмпірычных дадзеных;

– асноўныя метады аналізу эмпірычных дадзеных і іх тэарэтычнага асэнсавання;

***умець***:

– самастойна вырашаць на сучасным навуковым і метадычным узроўні навуковыя задачы фундаментальнага і прыкладнога характару;

– ажыццяўляць кваліфікаваны пошук, адбор, аналіз і абагульненне інфармацыі, актуальнай для навукова-даследчай работы;

– распрацоўваць і рэалізоўваць праграму правядзення даследчых і праектна-аналітычных работ;

– прадстаўляць вынікі навуковага даследавання;

– працаваць з навукова-крытычнай і даведачнай літаратурай;

***валодаць:***

– адпаведным тэрміналагічным і паняційным апаратам;

– навыкамі навуковай дыскусіі, прэзентацыі даследчых вынікаў і праектных рашэнняў;

– навыкамі самааналізу ўласнай даследчай дзейнасці;

– навыкамі колькасна-якаснага аналізу вынікаў даследавання, ажыццяўлення матэматыка-статыстычнай апрацоўкі дадзеных, фармулявання высноў і ўменняў публічнай абароны ўласнага навуковага даследавання;

– сучаснай методыкай і метадалогіяй літаратуразнаўчых даследаванняў.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» павінна забяспечыць фарміраванне ў навучэнцаў наступнай кампетэнцыі:

СК 8. Адбіраць матэрыял для даследавання, вызначаць метадалогію даследавання, рэпрэзентаваць яго вынікі.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» студэнт

павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Методыка напісання навукова-даследчых работ па беларускай літаратуры» адведзена:

– для дзённай формы атрымання адукацыі 108 гадзін, з іх 56 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах занятасці:

лекцыі – 28 гадзін, практычныя заняткі – 28 гадзін.

Працыёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая форма атэстацыі праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам спецыяльнасці ў форме заліка ў IV семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны. Спецыфіка навукова-даследчай работы

Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны. Прыярытэтныя навуковыя напрамкі ў галіне філалагічнай адукацыі. Навукова-даследчая дзейнасць студэнта як прафесійная дзейнасць маладога вучонага.

Навукова-даследчая дзейнасць, яе віды: інфармацыйна-рэфератыўны, праблемна-рэфератыўны, апісальны і даследчы. Вучэбна-лагічныя ўменні: аналіз і сінтэз, параўнанне, абагульненне і класіфікацыя, вызначэнне паняццяў, доказ і аспрэчванне, вызначэнне і вырашэнне праблем.

Метадалагічная база даследавання, выбар аптымальных метадаў даследавання, навуковая фармулёўка высноў. Агульнанавуковыя метады даследавання: назіранне, параўнанне, падлік (статыстычны метад), эксперымент, абагульненне, індукцыя і дэдукцыя, аналогія, мадэляванне і інш. Метады літаратуразнаўчага даследавання.

## Тэма 2. Асноўныя віды і методыка напісання навукова-даследчых работ па літаратуры

Агульная характарыстыка асноўных відаў даследчых работ па літаратуры. Навуковы артыкул, рэферат, даклад, праект.

Выбар і пастаноўка праблемы даследавання. Абгрунтаванне прадмета і аб’екта даследавання. Фармулёўка праблемы, мэты і задач даследавання. Арыгінальнасць і навуковая навізна даследавання. Вылучэнне гіпотэз у навуковых даследаваннях. Выбар і абгрунтаванне метадаў даследавання. Праца з паняційна-катэгарыяльным апаратам (іерархія і ўзаемасувязь тэрмінаў, паняццяў і катэгорый). Асновы пабудовы класіфікацый, устанаўленне ўзаемасувязей і заканамернасцей. Распрацоўка новых мадэляў, метадаў, методык. Арыгінальнасць навуковага падыходу.

## Тэма 3. Этапы даследчай дзейнасці

Дыягнастычны, прагнастычны, арганізацыйны этапы даследчай дзейнасці. Агульная характарыстыка этапаў даследчай дзейнасці: выбар тэмы; вызначэнне мэт, задач, аб’екта і прадмета даследавання; збор інфармацыі, складанне спіса выкарыстаных крыніц; запіс, перапрацоўка і сістэматызацыя матэрыялу; напісанне плана (тэзісаў) работы; напісанне навукова-даследчай работы; падрыхтоўка вывадаў і абагульненняў; рэдагаванне тэксту, прагназаванне найбольш верагодных пытанняў і адказаў на іх; публічнае выступленне.

## Тэма 4. Тэма, мэты, задачы, прадмет і аб’ект даследавання

Тэма даследавання, яе віды: інфармацыйна-рэфератыўныя, праблемна-рэфератыўныя, праблемныя, абагульняльныя, даследчыя. Патрабаванні да тэмы: актуальнасць, навуковасць, праблемнасць, дакладнасць, арыгінальнасць.

Мэта даследавання, патрабаванні да яе (адпаведнасць тэме, навуковасць, актуальнасць, удакладняльны характар у дачыненні да тэмы).

Задачы навуковага даследавання (канкрэтызацыя, дэталізацыя і падзел мэты на састаўныя элементы).

Паняцці аб’ект і прадмет даследавання.

### Тэма 5. Збор інфармацыі па тэме даследавання

Крыніцы інфармацыі і іх віды. Бібліяграфічныя даведнікі і часопісы. Электронныя бібліяграфічныя сродкі. Віды навуковых выданняў: навуковыя, навукова-папулярныя кнігі, манаграфіі, зборнікі навуковых артыкулаў, тэзісаў, матэрыялаў, дапаможнікі і падручнікі, навуковыя перыядычныя выданні, даведачная літаратура: энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі і інш.

Работа з навуковай літаратурай як адзін з этапаў даследавання. Папярэдняе знаёмства з навуковай кнігай. Загаловак, падзагаловак і іх роля. Структурныя кампаненты навуковай кнігі: анатацыя, змест, уступ, заключэнне, дадаткі. Алгарытмы вывучэння навуковай літаратуры (кнігі, артыкула): прагляд, першаснае чытанне, складанне плана тэксту, паўторнае чытанне. Формы запісу: цытаты, тэзісы, канспект.

Цытаты (выпіскі з крыніцы інфармацыі, пададзеныя словамі аўтара). Афармленне цытат (выкарыстанне, па магчымасці, закончаных частак, дакладнасць, захаванне аўтарскіх графічных вылучэнняў, афармленне з дапамогай двукосся, указанне крыніцы і інш.).

Тэзісы (палажэнні, якія сцісла перадаюць асноўныя думкі лекцыі, даклада, артыкула). Простыя і складаныя, кароткія і разгорнутыя, тэкстуальныя і вольныя тэзісы.

Канспект (перадача зместу тэксту ў лагічнай сістэме абгрунтаваных вывадаў). Віды канспекта – тэкстуальныя, вольныя, змешаныя. Алгарытмы напісання тэзісаў і канспектаў.

### Тэма 6. Структура навукова-даследчых работ па літаратуры

Кампазіцыя навуковай работы: уступ, асноўная частка, заключэнне, спіс выкарыстаных крыніц, дадаткі (схемы, табліцы, ілюстрацыі, мультымедыйныя прэзентацыі і інш.).

Уступ, яго прызначэнне і структура (фармулёўка сутнасці абранай для даследавання праблемы, яе значнасць і актуальнасць; вызначэнне мэты, задач, аб’екта і прадмета даследавання; агульны аналіз выкарыстанай літаратуры; сціслы выклад структуры работы і ўказанне поўнага аб’ёму даследавання ў старонках). Віды ўступаў (біяграфічны, гістарычны, аналітычны, параўнальны).

Асноўная частка, яе структура (раздзелы, у якіх паступова раскрываецца тэма, разглядаюцца яе пэўныя аспекты, выбудоўваецца сістэма доказаў). Віды доказаў (інфармацыйна-спасылачныя – цытаванне, лічбы, факты, азначэнні; лагічныя; эмацыйныя). Парадак размяшчэння раздзелаў: храналагічны, тэматычны, па прынцыпе параўнання або кантрасту, дэдуктыўны, індуктыўны, праблемны.

Заключэнне (вывады, высновы) – кароткі выклад сутнасці вынікаў даследчай работы, фармулёўка магчымых перспектыў, далейшых кірункаў даследавання абранай тэмы. Адпаведнасць колькасці і зместу пунктаў заключэння задачам і зместу самой работы. Спіс выкарыстаных крыніц. Дадаткі, іх віды.

### Тэма 7. Афармленне навукова-даследчых работ

Спецыфіка навуковага стылю: дакладнасць, лагічнасць, доказнасць, лаканічнасць; маналагічная форма выказвання; ужыванне навуковых тэрмінаў; складаныя сказы, уводныя канструкцыі, канструкцыі з умоўна-выніковымі, прычыннымі адносінамі; выкарыстанне безасабовых форм, займенніка мы і г.д. Афармленне тытульнага ліста, зместу, спіса выкарыстаных крыніц, спіса ўмоўных скарачэнняў. Афармленне і размяшчэнне дадаткаў; спасылкі на іх у тэксце работы.

### Тэма 8. Навуковы артыкул як жанр акадэмічнага тэксту

Навуковы артыкул як лагічна цэльны тэкст, прысвечаны вузкай тэме. Навуковы вынік артыкула як упершыню зафіксаваныя дакладныя веды ў пэўнай галіне навукі. Навуковая навізна і ўнікальнасць як адны з асноўных патрабаванняў да артыкула. Спецыфіка навукова-тэарэтычных, навукова-практычных, гісторыка-навуковых і дыскусійных артыкулаў.

Структура і аб’ём навуковага артыкула. Спецыфіка стварэння адпаведнага тэксту загалоўка навуковага артыкула. Ключавыя словы як пошукавы ключ да артыкула. Самастойнае вызначэнне індэксаў УДК артыкула. Анатацыя як жанр навуковага тэксту. Патрабаванні да анатацыі. Асноўная частка артыкула: спецыфіка структуравання. Уводзіны і заключэнне да артыкула як неад’емныя структурныя элементы, правілы іх напісання. Неабходнасць прадстаўлення высноў даследавання ў нагляднай форме. Патрабаванні да аб’ёму і структуры спіса выкарыстаных крыніц.

### Тэма 9. Курсавая работа і дыпломнае даследаванне і патрабаванні да іх афармлення

Асноўныя характарыстыкі курсавой работы і дыпломнага даследавання. Правілы афармлення курсавой і дыпломнай работ, публікацый па тэме. Структура курсавой і дыпломнай работ і іх афармленне. Структура і афармленне навуковых публікацый па тэме курсавой і дыпломнай работ. Тэарэтычныя крыніцы і віды публікацый. Правілы выбару тэарэтычных крыніц. Спасылкі, спіс выкарыстаных крыніц. Парадак цытавання інфармацыйных і літаратурных крыніц, якія выкарыстоўваюцца ў навуковай рабоце. Правілы цытавання па ВАК і ДАСТ. Спецыфіка праверкі тэкстаў на антыплагіят.

### Тэма10. Прэзентацыя вынікаў навуковых даследаванняў

Прэзентацыя вынікаў навукова-даследчых і навукова-практычных даследаванняў на семінарах і канферэнцыях рознага ўзроўню. Праблема

прэзентацыі незавершаных работ і праектаў. Асаблівасці вуснай прэзентацыі акадэмічнага тэксту. Рытарычныя стратэгіі выступлення. Тэмп выступлення, таймінг.

Прэзентацыя як візуальная версія выступлення. Аб’ём і структура візуальнай прэзентацыі. Дызайн прэзентацыі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ «МЕТОДЫКА НАПІСАННЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРУРЫ»
### дзённая форма атрымання адукацыі

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, пытанні па тэме | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная (пазааўдыторная) работа | Метадычныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **IV семестр** | | | | | | |
| | **МЕТОДЫКА НАПІСАННЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРУРЫ** | **28** | **28** | **52** | | | |
| **1.** | **Уводзіны. Спецыфіка навукова-даследчай работы** | **4** | | **4** | | | |
| | 1. Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны.<br>2. Прыярытэтныя навуковыя напрамкі ў галіне філалагічнай адукацыі.<br>3. Навукова-даследчая дзейнасць, яе віды.<br>4. Вучэбна-лагічныя ўменні.<br>5. Метадалагічная база даследавання, выбар аптымальных метадаў даследавання, навуковая фармулёўка высноў.<br>6. Агульнанавуковыя метады даследавання.<br>7. Метады літаратуразнаўчага даследавання. | | | | Схемы «Віды навукова-даследчай дзейнасці», «Метады даследавання». | [1]<br>[2]<br>[4] | |
| **2.** | **Асноўныя віды і методыка напісання навукова-даследчых работ па літаратуры** | **4** | **2** | **6** | | | |
| ***2.1.*** | ***Асноўныя віды і методыка напісання навукова-даследчых работ па літаратуры*** | ***4*** | | | | | |
| | 1. Агульная характарыстыка асноўных відаў даследчых работ па літаратуры. Навуковы артыкул, рэферат, даклад, праект.<br>2. Выбар і пастаноўка праблемы даследавання. | | | | Схема «Віды навукова-даследчых работ». | [1]<br>[2]<br>[4] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 3. Абгрунтаванне прадмета і аб’екта даследавання.<br>4. Фармулёўка праблемы, мэты і задач даследавання.<br>5. Вылучэнне гіпотэз у навуковых даследаваннях. Выбар і абгрунтаванне метадаў даследавання.<br>6. Праца з паняційна-катэгарыяльным апаратам.<br>7. Распрацоўка новых мадэляў, метадаў, методык. | | | | Современное зарубежное литературоведение: страны Западной Европы и США: концепции, школы, термины : энцикл. справ. / А. В. Дранов [и др.] ; науч. ред.-сост.: И. П. Ильин, Е. А. Цурганова. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Интрада, 1999. – 320 с. | | |
| ***2.2.*** | ***Методыка напісання навукова-даследчых работ па літаратуры*** | | **2** | **6** | | | |
| | 1. Навуковы артыкул, рэферат, даклад, праект.<br>2. Праблема даследавання. Прадмет і аб’ект даследавання. Мэта і задачы даследавання. Гіпотэза даследавання.<br>3. Метады даследавання.<br>4. Іерархія і ўзаемасувязь тэрмінаў, паняццяў і катэгорый.<br>5. Арыгінальнасць навуковага падыходу. | | | | Современное зарубежное литературоведение: страны Западной Европы и США: концепции, школы, термины : энцикл. справ. / А. В. Дранов [и др.] ; науч. ред.-сост.: И. П. Ильин, Е. А. Цурганова. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Интрада, 1999. – 320 с. | [1]<br>[2]<br>[4] | Франтальная гутарка па тэме, рэферыраванне навуковай літаратуры. |
| **3.** | **Этапы даследчай дзейнасці** | **4** | **2** | **6** | | | |
| ***3.1.*** | ***Этапы даследчай дзейнасці*** | ***4*** | | | | | |
| | 1. Дыягнастычны, прагнастычны, арганізацыйны этапы даследчай дзейнасці.<br>2. Агульная характарыстыка этапаў даследчай дзейнасці. | | | | Схема «Этапы навукова-даследчай дзейнасці». | [1]<br>[2]<br>[4] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | [6] | |
| ***3.2.*** | ***Даследчая дзейнасць па літаратуры*** | | ***2*** | ***6*** | | | |
| | 1. Выбар тэмы.<br>2. Вызначэнне мэт, задач, аб’екта і прадмета даследавання.<br>3. Збор інфармацыі, складанне спіса выкарыстаных крыніц.<br>4. Запіс, перапрацоўка і сістэматызацыя матэрыялу.<br>5. Напісанне плана (тэзісаў) работы.<br>6. Напісанне навукова-даследчай работы.<br>7. Падрыхтоўка вывадаў і абагульненняў.<br>8. Рэдагаванне тэксту, прагназаванне найбольш верагодных пытанняў і адказаў на іх.<br>9. Публічнае выступленне. | | | | Схема «Этапы навукова-даследчай дзейнасці». | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | Калёквіум. |
| **4.** | **Тэма, мэты, задачы, прадмет і аб’ект даследавання** | **2** | **2** | **4** | | | |
| ***4.1.*** | ***Тэма, мэты, задачы, прадмет і аб’ект даследавання*** | ***2*** | | | | | |
| | 1. Тэма даследавання, яе віды. Патрабаванні да тэмы.<br>2. Мэта даследавання, патрабаванні да яе.<br>3. Задачы навуковага даследавання (канкрэтызацыя, дэталізацыя і падзел мэты на састаўныя элементы).<br>4. Паняцці аб’ект і прадмет даследавання. | | | | Прыклады навукова-даследчых работ па літаратуры. | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | |
| ***4.2.*** | ***Методыка фармулёўкі тэмы мэты, задачы, прадмета і аб’екта даследавання*** | | ***2*** | ***4*** | | | |
| | 1. Інфармацыйна-рэфератыўныя, праблемна-рэфератыўныя, праблемныя, абагульняльныя, даследчыя тэмы.<br>2. Актуальнасць, навуковасць, праблемнасць, дакладнасць, арыгінальнасць тэмы.<br>3. Адпаведнасць мэты тэме даследавання, навуковасць, актуальнасць, удакладняльны характар у дачыненні да тэмы.<br>4. Канкрэтызацыя, дэталізацыя і падзел мэты на састаўныя элементы ў задачах даследавання.<br>5. Фармулёўка аб’екта і прадмета даследавання. | | | | Прыклады навукова-даследчых работ па літаратуры.<br>Аўтарэфераты па беларускай літаратуры. | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | Рэцэнзаванне аўтарэфератаў (https://vak.gov.by/library). |
| **5.** | **Збор інфармацыі па тэме даследавання** | **2** | **2** | **4** | | | |
| ***5.1.*** | ***Збор інфармацыі па тэме даследавання*** | ***2*** | | | | | |
| | 1. Крыніцы інфармацыі і іх віды.<br>2. Работа з навуковай літаратурай як адзін з этапаў | | | | Навуковая літаратура, часопісы. | [1]<br>[2] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | даследавання.<br>3. Загаловак, падзагаловак і іх роля.<br>4. Структурныя кампаненты навуковай кнігі: анатацыя, змест, уступ, заключэнне, дадаткі.<br>5. Алгарытмы вывучэння навуковай літаратуры.<br>6. Формы запісу: цытаты, тэзісы, канспект. | | | | | [4]<br>[6] | |
| ***5.2.*** | ***Методыка работы з інфармацыяй*** | | ***2*** | ***4*** | | | |
| | 1. Бібліяграфічныя даведнікі і часопісы.<br>2. Электронныя бібліяграфічныя сродкі.<br>3. Віды навуковых выданняў: навуковыя, навукова-папулярныя кнігі, манаграфіі, зборнікі навуковых артыкулаў, тэзісаў, матэрыялаў, дапаможнікі і падручнікі, навуковыя перыядычныя выданні, даведачная літаратура: энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі і інш.<br>4. Методыка работы з навуковай літаратурай: прагляд, першаснае чытанне, складанне плана тэксту, паўторнае чытанне.<br>5. Афармленне цытат (выкарыстанне, па магчымасці, закончаных частак, дакладнасць, захаванне аўтарскіх графічных вылучэнняў, афармленне з дапамогай двукосся, указанне крыніцы і інш.).<br>6. Простыя і складаныя, кароткія і разгорнутыя, тэкстуальныя і вольныя тэзісы.<br>7. Віды канспекта – тэкстуальныя, вольныя, змешаныя.<br>8. Алгарытмы напісання тэзісаў і канспектаў. | | | | Навуковая літаратура, часопісы. | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | Праверка бібліяграфічных спісаў (https://vak.gov.by/node/8026). |
| **6.** | **Структура навукова-даследчых работ па літаратуры** | **2** | **4** | **6** | | | |
| ***6.1.*** | ***Структура навукова-даследчых работ па літаратуры*** | ***2*** | | | | | |
| | 1. Кампазіцыя навуковай работы.<br>2. Уступ.<br>3. Асноўная частка.<br>4. Заключэнне.<br>5. Спіс выкарыстаных крыніц.<br>6. Дадаткі (схемы, табліцы, ілюстрацыі, мультымедыйныя прэзентацыі і інш.). | | | | Схема «Кампазіцыя навукова-даследчых работ па літаратуры». | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | |
| ***6.2.*** | ***Патрабаванні да структуры навукова-даследчых работ*** | | ***4*** | ***6*** | | | |
| | 1. Уступ, яго прызначэнне і структура. Віды ўступаў | | | | Схема «Кампазіцыя | [1] | Франтальная |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | (біяграфічны, гістарычны, аналітычны, параўнальны).<br>2. Асноўная частка, яе структура (раздзелы, у якіх паступова раскрываецца тэма, разглядаюцца яе пэўныя аспекты, выбудоўваецца сістэма доказаў).<br>3. Віды доказаў (інфармацыйна-спасылачныя – цытаванне, лічбы, факты, азначэнні; лагічныя; эмацыйныя).<br>4. Парадак размяшчэння раздзелаў: храналагічны, тэматычны, па прынцыпе параўнання або кантрасту, дэдуктыўны, індуктыўны, праблемны.<br>5. Заключэнне як кароткі выклад сутнасці вынікаў даследчай работы, фармулёўка магчымых перспектыў, далейшых кірункаў даследавання абранай тэмы. Адпаведнасць колькасці і зместу пунктаў заключэння задачам і зместу работы.<br>6. Спіс выкарыстаных крыніц. Дадаткі, іх віды. | | | | навукова-даследчых работ па літаратуры». | [2]<br>[4]<br>[6] | гутарка па тэме. |
| **7.** | **Афармленне навукова-даследчых работ** | **4** | **4** | **6** | | | |
| ***7.1.*** | ***Афармленне навукова-даследчых работ*** | ***4*** | | | | | |
| | 1. Спецыфіка навуковага стылю.<br>2. Афармленне тытульнага ліста, зместу, спіса выкарыстаных крыніц, спіса ўмоўных скарачэнняў.<br>3. Афармленне і размяшчэнне дадаткаў; спасылкі на іх у тэксце работы. | | | | Тэксты навуковага стылю.<br>Прыклады навукова-даследчых работ. | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | |
| ***7.2.*** | ***Патрабаванні да афармлення навукова-даследчых работ*** | | ***4*** | ***6*** | | | |
| | 1. Дакладнасць, лагічнасць, доказнасць, лаканічнасць; маналагічная форма выказвання; ужыванне навуковых тэрмінаў; складаныя сказы, уводныя канструкцыі, канструкцыі з умоўна-выніковымі, прычыннымі адносінамі; выкарыстанне безасабовых формаў пры афармленні навукова-даследчых работ.<br>2. Афармленне тытульнага ліста.<br>3. Афармленне зместу.<br>4. Афармленне спіса выкарыстаных крыніц.<br>5. Афармленне спіса ўмоўных скарачэнняў.<br>6. Афармленне дадаткаў. | | | | Тэксты навуковага стылю.<br>Прыклады навукова-даследчых работ. | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | Калёквіум. |
| **8.** | **Навуковы артыкул як жанр акадэмічнага тэксту** | **2** | **4** | **6** | | | |
| ***8.1.*** | ***Навуковы артыкул як жанр акадэмічнага тэксту*** | ***2*** | | | | | |
| | 1. Навуковы артыкул як лагічна цэльны тэкст, прысвечаны | | | | Навуковыя артыкулы. | [1] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | вузкай тэме.<br>2. Структура і аб’ём навуковага артыкула.<br>3. Ключавыя словы як пошукавы ключ да артыкула. УДК артыкула.<br>4. Анатацыя як жанр навуковага тэксту.<br>5. Асноўная частка артыкула, уводзіны і заключэнне.<br>6. Патрабаванні да аб’ёму і структуры спіса выкарыстаных крыніц. | | | | | [2]<br>[3]<br>[5] | |
| ***8.2.*** | ***Методыка напісання навуковых артыкулаў па літаратуры*** | | ***4*** | ***6*** | | | |
| | 1. Спецыфіка навуковых артыкулаў.<br>2. Навуковы вынік артыкула як упершыню зафіксаваныя дакладныя веды ў пэўнай галіне навукі.<br>3. Навуковая навізна і ўнікальнасць як адны з асноўных патрабаванняў да артыкула.<br>4. Спецыфіка навукова-тэарэтычных, навукова-практычных, гісторыка-навуковых і дыскусійных артыкулаў.<br>5. Патрабаванні да структуры і аб’ёму навуковага артыкула.<br>6. Спецыфіка стварэння адпаведнага тэксту загалоўка навуковага артыкула.<br>7. Методыка вызначэння ключавых слоў. Самастойнае вызначэнне індэксаў УДК артыкула.<br>8. Патрабаванні да анатацыі.<br>9. Спецыфіка структуравання асноўнай часткі артыкула.<br>10. Уводзіны і заключэнне да артыкула як неад’емныя структурныя элементы, правілы іх напісання.<br>11. Спіс выкарыстаных крыніц, правілы яго афармлення. | | | | Навуковыя артыкулы. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[5] | Рэцэнзаванне навуковых артыкулаў (https://elib.bspu.by/). |
| **9.** | **Курсавая работа і дыпломнае даследаванне і патрабаванні да іх афармлення** | **4** | **4** | **6** | | | |
| ***9.1.*** | ***Курсавая работа і дыпломнае даследаванне і патрабаванні да іх афармлення*** | ***4*** | | | | | |
| | 1. Асноўныя характарыстыкі курсавой работы і дыпломнага даследавання. Іх адрозненне.<br>2. Правілы афармлення курсавой работы.<br>3. Правілы афармлення дыпломнай работы.<br>4. Правілы афармлення публікацый па тэме. | | | | Курсавыя і дыпломныя работы студэнтаў.<br>«Положение о порядке подготовки и | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 5. Спецыфіка праверкі тэкстаў на антыплагіят. | | | | представления к защите курсовых работ в БГПУ». «Положение о порядке подготовки и представления к защите дипломных проектов (дипломных работ) в БГПУ». | | |
| ***9.2.*** | ***Методыка напісання і афармлення курсавых работ дыпломных даследаванняў*** | | ***4*** | ***6*** | | | |
| | 1. Структура курсавой і дыпломнай работ і іх афармленне.<br>2. Структура і афармленне навуковых публікацый.<br>3. Тэарэтычныя крыніцы і віды публікацый.<br>4. Спасылкі, спіс выкарыстаных крыніц. Парадак цытавання інфармацыйных і літаратурных крыніц, якія выкарыстоўваюцца ў навуковай рабоце.<br>5. Правілы цытавання па ВАК і ДАСТ. | | | | «Положение о порядке подготовки и представления к защите курсовых работ в БГПУ». «Положение о порядке подготовки и представления к защите дипломных проектов (дипломных работ) в БГПУ». | [1]<br>[2]<br>[4]<br>[6] | Абмеркаванне тэзісаў навуковай работы. |
| **10.** | **Прэзентацыя вынікаў навуковых даследаванняў** | | **4** | **4** | | | |
| | 1. Прэзентацыя вынікаў навукова-даследчых і навукова-практычных даследаванняў на семінарах і канферэнцыях рознага ўзроўню.<br>2. Праблема прэзентацыі незавершаных работ і праектаў.<br>3. Асаблівасці вуснай прэзентацыі акадэмічнага тэксту.<br>4. Рытарычныя стратэгіі выступлення. Тэмп выступлення, таймінг.<br>5. Прэзентацыя як візуальная версія выступлення. Аб'ём і структура візуальнай прэзентацыі. Дызайн прэзентацыі. | | | | Праграмы навуковых канферэнцый. | [1]<br>[2]<br>[3]<br>[4]<br>[5]<br>[6] | Абарона дакладаў і выступленняў. |
| | **Усяго** | **28** | **28** | **52** | | | **Залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Курсавыя і дыпломныя работы па беларускай літаратуры і методыцы выкладання: дапаможнік / Т. У. Ганчарова-Цынкевіч, І. М. Гоўзіч, А. У. Жардзецкая, М. С. Рак. – Мінск : БДПУ, 2020. – 92 с.
2. Паўлоўская, Н. Ю. Метадалогія навуковага даследавання: тыпалагічны аспект : вучэб.-метад. дапам. для студэнтаў установ выш. адукацыі / Н. Ю. Паўлоўская, В. А. Арцёмава, В. М. Гапеева. – Мінск : Мін. дзярж. лінгвіст. ун-т, 2018. – 147 с.

**Дадатковая літаратура**

3. Варенова, Т. В. Методические рекомендации по написанию научной статьи (тезисов) [Электронный ресурс] / Т. В. Варенова // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/46717. – Дата доступа: 20.03.2024.
4. Зайцева, И. П. Основы научно-исследовательской деятельности (языкознание) : учеб. пособие / И. П. Зайцева. – Минск : Респ. ин-т высш. шк., 2021. – 197 с.
5. Куницкая, О. С. Методические рекомендации студенту, магистранту по написанию научной статьи [Электронный ресурс] / О. С. Куницкая // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/50958. – Дата доступа: 20.03.2023.
6. Методология научно-педагогического исследования [Электронный ресурс] : электрон. учеб.-метод. комплекс / сост. В. Н. Шебеко // Репозиторий БГПУ. – Режим доступа: http://elib.bspu.by/handle/doc/44789. – Дата доступа: 20.03.2024.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ «МЕТОДЫКА НАПІСАННЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧЫХ РАБОТ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРУРЫ»

Самастойная работа студэнтаў з’яўляецца адным з найважнейшых і найбольш эфектыўных элементаў навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Гэта сумесная дзейнасць выкладчыка і студэнта, накіраваная на самастойнае авалоданне студэнтам часткай дысцыпліны пры дапамозе спецыяльна распрацаванага навукова-метадычнага забеспячэння, якая прадугледжвае арганізацыю дадатковых кансультацый і спецыяльных відаў кантролю з боку выкладчыка, акрамя прадугледжаных вучэбным планам форм прамежкавага і выніковага кантролю кампетэнцый студэнтаў па дысцыпліне.

Мэта самастойнай работы студэнтаў: развіццё ўнутраных псіхалагічных механізмаў інтэлектуальнай актыўнасці студэнтаў, іх пазнавальных здольнасцей шляхам уключэння ў ініцыятыўную вучэбную і навукова-прафесійную дзейнасць, павышэнне канкурэнтаздольнасці выпускнікоў ВНУ праз фарміраванне ў іх кампетэнцый самаадукацыі.

Віды самастойнай працы студэнтаў:

а) рэпрадуктыўная (вучэбная, кансультацыйная), якая ўключае выкананне заданняў з вучэбнай літаратуры.

б) прадуктыўная (даследчая), якая ўключае выкананне навукова-даследчай работы; вывучэнне, анатаванне, рэферыраванне дадатковай вучэбнай літаратуры; падрыхтоўку да канферэнцый і г.д.

Формы самастойнай работы студэнтаў: падрыхтоўка да лекцый і практычных заняткаў; вывучэнне вучэбных дапаможнікаў; вывучэнне тэм і праблем, якія не выносяцца на лекцыі і практычныя заняткі; падрыхтоўка рэфератаў, паведамленняў і дакладаў; складанне бібліяграфіі і рэферыраванне па самастойна вывучанай тэме.

**Прыкладны пералік і кароткая характарыстыка ацэначных сродкаў**

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС в ВП |
|---|---|---|---|
| 1. | Рэферат | Прадукт самастойнай работы студэнта – кароткі выклад у пісьмовай форме атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай тэмы, у якім аўтар перадае змест матэрыялу, прыводзіць розныя пункты гледжання, а таксама ўласны погляд на яе | Тэматыка рэфератаў |
| 2. | Паведамленне | Сродак, які спрыяе ацэнцы ўмення студэнта пісьмова выкладаць сутнасць вызначанай праблемы, рабіць высновы, якія абагульняюць аўтарскую пазіцыю па пэўнай праблеме | Тэматыка паведамленняў |

| № п/п | Найменне АС | Кароткая характарыстыка АС | Прадстаўленне АС в ВП |
|---|---|---|---|
| 3. | Даклад | Прадукт самастойнай работы студэнта, публічнае выступленне з прэзентацыяй атрыманых вынікаў аналізу пэўнай тэмы ці праблемы | Тэматыка дакладаў |
| 4. | Канспект | Прадукт самастойнай работы студэнта – поўны выклад у пісьмовай форме атрыманых вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай тэмы, у якім аўтар перадае змест матэрыялу | Спіс літаратуры для канспектавання |
| 5. | Бібліяграфічны спіс | Прадукт самастойнай работы студэнта, які ўяўляе сабой спіс літаратуры па пэўнай тэме ці праблеме, неабходнай для яе вывучэння | Пералік тэм для складання бібліяграфічнага спіса |
| 6. | Навуковы артыкул | Прадукт самастойнай работы студэнта, які ўяўляе закончанае і лагічна цэласнае міні-даследаванне, прысвечанае канкрэтнаму пытанню, мэта якога – прааналізаваць пэўную з'яву з пункта гледжання заканамернасцей, якія знаходзяцца ў яе аснове | Пралік тэм для напісання артыкулаў |

**ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ КАНТРОЛЬНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ**

**дзённая форма атрымання адукацыі**

| № п/п | Назва тэмы | Колькасць гадзін на СРС | Заданні | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Тэма 1. Уводзіны. Спецыфіка навукова-даследчай работы. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял, прачытаць неабходныя літаратуразнаўчыя тэксты.<br>Падрыхтаваць рэферат па тэме «Прыярытэтныя навуковыя напрамкі ў галіне філалагічнай адукацыі». | Падрыхтоўка рэфератаў. Рэферыраванне літаратуры па самастойна вывучанай тэме. |
| 2. | Тэма 2. Асноўныя віды і методыка напісання навукова-даследчых работ па літаратуры. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Прааналізаваць навуковыя артыкулы студэнтаў па літаратуры. | Падрыхтоўка паведамленняў. |
| 3. | Тэма 3. Этапы даследчай дзейнасці. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Напісаць рэкамендацыі «Як падрыхтавацца да публічнага выступлення». | Падрыхтоўка рэкамендацый «Як падрыхтавацца да публічнага выступлення». |
| 4. | Тэма 4. Тэма, мэты, задачы, прадмет і аб’ект даследавання. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Выбраць тэму, сфармуляваць мэту, задачы, прадмет і аб’ект даследавання. | Падрыхтоўка рэфератаў. |
| 5. | Тэма 5. Збор інфармацыі па тэме даследавання. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падабраць неабходныя навуковыя выданні па тэме даследавання і скласці бібліяграфічны спіс па тэме навукова-даследчай работы. | Падрыхтоўка бібліяграфічнага спіса. |
| 6. | Тэма 6. Структура навукова-даследчых работ па літаратуры. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Распрацаваць і прааналізаваць уступ і | Падрыхтоўка паведамленняў. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | | | заключэнне навукова-даследчай работы. | |
| 7. | Тэма 7. Афармленне навукова-даследчых работ. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Выправіць афармленне навукова-даследчых работ. | Падрыхтоўка паведамленняў. |
| 8. | Тэма 8. Навуковы артыкул як жанр акадэмічнага тэксту. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Напісаць навуковы артыкул для ўдзелу ў канферэнцыі. | Напісанне артыкулаў. |
| 9. | Тэма 9. Курсавая работа і дыпломнае даследаванне і патрабаванні да іх афармлення. | 6 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Законспектаваць асноўны змест:<br>1. «Положение о порядке подготовки и представления к защите курсовых работ в БГПУ»;<br>2. «Положение о порядке подготовки и представления к защите дипломных проектов (дипломных работ) в БГПУ». | Канспектаванне нарматыўных дакументаў. |
| 10. | Тэма 10. Прэзентацыя вынікаў навуковых даследаванняў. | 4 | Вывучыць адпаведны тэме матэрыял.<br>Падрыхтаваць даклад па тэме даследавання для ўдзелу ў навуковай канферэнцыі. | Навуковая канферэнцыя. |
| | **УСЯГО** | **52** | | |

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Для бягучага кантролю якасці засваення ведаў студэнтамі выкарыстоўваецца наступны дыягнастычны інструментарый:

– індывідуальная гутарка са студэнтамі для выяўлення якасці ведаў матэрыялу;

– франтальнае апытванне;

– вусная праверка атрыманых ведаў;

– праверка наяўнасці законспектаванай і рэферыраванай вучэбнай літаратуры;

– праверка выкананых даследчых заданняў;

– ацэнка ўзроўню абароны падрыхтаваных рэфератаў, паведамленняў і дакладаў;

– даследаванне ўзроўню і вызначэнне якасці аналітычнай апрацоўкі тэксту праз вусныя ці пісьмовыя выступленні студэнтаў;

– праверка выкананых практычных заданняў.

Ацэнка за выкананне заданняў, рэфератаў, дакладаў уключае: правільнасць выканання задання; адпаведнасць і паўната раскрыцця тэмы; якасць выканання работы; самастойнасць меркаванняў; логіка падачы інфармацыі; афармленне.

### Прыкладныя крытэрыі і паказчыкі ацэнкі выканання студэнтамі работ, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе бягучай атэстацыі і СР

| **Крытэрый** | **Паказчыкі** |
|---|---|
| | **Рэферат / паведамленне /даклад** |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай літаратуры | – аб'ём навуковай літаратуры дастатковы;<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 2 заўвагі) |
| Сапраўднасць інфармацыі (дакладнасць, абгрунтаванасць, наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі) | – інфармацыя дакладная, абгрунтаваная, утрымлівае спасылкі на выкарыстаныя крыніцы інфармацыі;<br>– інфармацыя мае заўвагі па адным пункце з трох |
| Неабходнасць і дастатковасць інфармацыі | – прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў;<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| | **Канспект** |
| Адпаведнасць канспекта плану зместу | – канспект адпавядае плану зместу;<br>– канспект часткова адпавядае плану зместу (не |

| Крытэрый | Паказчыкі |
|---|---|
| крыніцы | больш за 2 заўвагі) |
| Адлюстраванне ў канспекце асноўных палажэнняў крыніцы і наяўнасць вывадаў | – асноўныя палажэнні адлюстраваны, вывады прадстаўленыя;<br>– асноўныя палажэнні адлюстраваны, вывады не прадстаўленыя |
| Выразнасць, лаканічнасць выкладу | – выклад выразны і лаканічны;<br>– выклад мае заўвагі па адным пункце з двух |
| **Бібліяграфічны спіс** | |
| Дакладнасць інфармацыі | – інфармацыя дакладная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| Сапраўднасць інфармацыі | – інфармацыя сапраўдная;<br>– інфармацыя мае заўвагі (не больш за 2) |
| **Навуковы артыкул** | |
| Структура артыкула | – структура адпавядае патрабаванням;<br>– структура адпавядае патрабаванням часткова (не больш за 1 заўвагу) |
| Ступень раскрыцця тэмы | – тэма раскрыта поўнасцю;<br>– тэма раскрыта часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Аб'ём выкарыстанай навуковай літаратуры | – аб'ём навуковай літаратуры дастатковы;<br>– аб'ём навуковай літаратуры недастатковы (не больш за 2 заўвагі) |
| Сапраўднасць інфармацыі (дакладнасць, абгрунтаванасць, наяўнасць спасылак на крыніцы інфармацыі) | – інфармацыя дакладная, абгрунтаваная, утрымлівае спасылкі на выкарыстаныя крыніцы інфармацыі;<br>– інфармацыя мае заўвагі па адным пункце з трох |
| Неабходнасць і дастатковасць інфармацыі | – прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў;<br>– прыведзеныя дадзеныя і факты выкарыстоўваюцца для абгрунтавання ці ілюстрацыі пэўных тэзісаў і палажэнняў часткова (не больш за 2 заўвагі) |
| Самастойнасць меркаванняў і аргументацыі | – самастойныя меркаванні пацвярджаюцца аналізам канкрэтных фактаў і прыкладаў;<br>– самастойныя меркаванні не пацвярджаюцца аналізам канкрэтных фактаў і прыкладаў |
| Афармленне артыкула | – афармленне правільнае;<br>– афармленне адпавядае патрабаванням часткова (не больш за 2 заўвагі) |

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПАВЕДАМЛЕННЯЎ, РЭФЕРАТАЎ, ДАКЛАДАЎ

1. Агульнанавуковыя метады даследавання.
2. Метады літаратуразнаўчага даследавання.
3. Навуковы артыкул, яго адметнасць.
4. Рэферат і яго асаблівасці.
5. Даклады па літаратуры, іх віды.
6. Прадмет і аб'ект даследавання.
7. Як правільна фармуляваць праблему, мэту і задач даследавання.
8. Крыніцы інфармацыі і іх віды.
9. Правілы афармлення цытат.
10. Асаблівасці кампазіцыі навукова-даследчай работы.
11. Правілы афармлення спіса выкарыстанай літаратуры.
12. Асаблівасці вуснага выступлення па тэме навукова-даследчай работы.

## СПІС КРЫНІЦ ДЛЯ РЭФЕРЫРАВАННЯ, КАНСПЕКТАВАННЯ

1. Варенова, Т. В. Методические рекомендации по написанию научной статьи (тезисов) / Т. В. Варенова // Репозиторий БГПУ. – URL: http://elib.bspu.by/handle/doc/46717 (дата обращения: 20.11.2024).
2. Куницкая, О. С. Методические рекомендации студенту, магистранту по написанию научной статьи / О. С. Куницкая // Репозиторий БГПУ. – URL: http://elib.bspu.by/handle/doc/50958 (дата обращения: 20.11.2024).
3. Методология научно-педагогического исследования : электрон. учеб.-метод. комплекс / сост. В. Н. Шебеко // Репозиторий БГПУ. – URL: http://elib.bspu.by/handle/doc/44789 (дата обращения: 20.03.2024).
4. Положение о порядке подготовки и представления к защите курсовых работ в БГПУ.
5. Положение о порядке подготовки и представления к защите дипломных проектов (дипломных работ) в БГПУ.
6. Современное зарубежное литературоведение: страны Западной Европы и США: концепции, школы, термины : энцикл. справ. / А. В. Дранов [и др.] ; науч. ред.-сост.: И. П. Ильин, Е. А. Цурганова. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Интрада, 1999. – 320 с.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ТЭМ ДЛЯ СКЛАДАННЯ БІБЛІЯГРАФІЧНАГА СПІСА І НАПІСАННЯ АРТЫКУЛАЎ

1. Трансфармацыя старажытных жанраў у сучаснай літаратуры.
2. Сродкі мастацкай выразнасці ў паэме Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра».
3. «Як промень сонечны...»: вобраз Ефрасінні Полацкай у беларускай літаратуры.
4. «Народу свайму слугуючы...»: вобраз Францыска Скарыны ў сучаснай беларускай літаратуры.
5. «Дачка я волі...»: вобраз Рагнеды ў беларускай літаратуры.
6. Міфалагічна-фантастычны свет твораў «Шляхціц Завальня» Яна Баршчэўскага і «Вій» Мікалая Гогаля.
7. Сродкі мастацкай выразнасці ў паэзіі Францішка Багушэвіча.
8. Мастацкія асаблівасці драматургіі Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча.
9. Вобраз музыкі ў беларускай паэзіі (Францішак Багушэвіч, Цётка, Якуб Колас, Янка Купала).
10. Мастацка-вобразны свет паэзіі Янкі Купалы.
11. Прыёмы і сродкі псіхалагічнага раскрыцця характару ў прозе Якуба Коласа.
12. Класічныя жанравыя формы ў творчасці Максіма Багдановіча.
13. «Вянок» Максіма Багдановіча як паэтычная містэрыя.
14. Першая сусветная вайна ў мастацкім адлюстраванні Максіма Гарэцкага.
15. «Нескароны талент»: жыццёвыя і творчыя перыпетыі Міхася Зарэцкага.
16. Народная культура ў «Палескай хроніцы» Івана Мележа.
17. «Філасофія шчасця» герояў «Палескай хронікі» Івана Мележа.
18. Духоўныя лабірынты герояў апавяданняў Кузьмы Чорнага.
19. Асаблівасці стылю Кузьмы Чорнага (на прыкладзе рамана «Пошукі Будучыні»).
20. «Радзіме – радок і жыццё»: лірыка ваенных гадоў.
21. Хатынская тэма ў беларускай прозе.
22. Тэма «абпаленага вайной дзяцінства» ў паэзіі прадстаўнікоў «філалагічнага пакалення» (Р. Барадулін, Н. Гілевіч, Г. Бураўкін).
23. Чалавек і час у лірыцы Аркадзя Куляшова.
24. Класічныя жанравыя формы ў творчасці Максіма Танка.
25. На ветраках гісторыі: публіцыстычны пафас паэзіі Пімена Панчанкі.
26. Малыя празаічныя формы ў мастацкай сістэме Янкі Брыля.
27. Праблема выбару ў творах Васіля Быкава.
28. Творчасць Васіля Быкава: спецыфіка ўвасаблення тэмы кахання.
29. Маральна-этычныя праблемы ў творах Івана Шамякіна пра сучаснасць.
30. Праблема «бацькоў і дзяцей» у творчасці Івана Тургенева і Івана Шамякіна.

31. Жанравыя асаблівасці балады Уладзіміра Караткевіча.
32. Драматургічная спадчына Уладзіміра Караткевіча.
33. Уладзімір Караткевіч і сучасны мастацкі дэтэктыў.
34. Своеасаблівасць творчай манеры Ніла Гілевіча.
35. Маладое пакаленне на вайне (паводле апавяданняў / раманаў Івана Навуменкі).
36. Паэтычнае майстэрства Рыгора Барадуліна.
37. Жанрава-стылёвыя асаблівасці прозы Міхася Стральцова.
38. Мастацка-вобразны свет паэзіі Васіля Зуёнка.
39. «Веча славянскіх балад» Янкі Сіпакова – мастацкі летапіс славянскіх народаў.
40. Жанравая палітра творчасці Анатоля Вярцінскага.
41. Мастацкія асаблівасці лірыкі Яўгеніі Янішчыц.
42. Вобраз жанчыны-маці ў беларускай лірыцы (Максім Танк, Рыгор Барадулін, Яўгенія Янішчыц).
43. Асаблівасці мастацка-вобразнага свету паэзіі Леаніда Дранько-Майсюка.
44. «Рамонкі для самотнай»: эвалюцыя лірычнай гераіні Раісы Баравіковай.
45. Канфлікты і характары ў п’есах Аляксея Дударава.
46. Традыцыі і наватарства паэзіі Алеся Разанава.
47. Чарнобыльская тэма ў сучаснай беларускай паэзіі.
48. Чарнобыльская трагедыя ў беларускай прозе.
49. Класічныя вершаваныя формы ў сучаснай беларускай паэзіі.
50. Сучасная беларуская ўрбаністычная паэзія: жанравая палітра, лірычны герой.
51. Сучасны беларускі дэтэктыў: вытокі і здабыткі жанру.
52. Фантастыка і фэнтэзі ў сучаснай беларускай літаратуры.
53. Праблематыка і жанрава-стылёвыя пошукі сучаснай беларускай прозы.
54. Мастацкае асэнсаванне гісторыі ў творах сучасных пісьменнікаў.
55. Жанрава-тэматычная разнастайнасць сучаснай беларускай драматургіі.

# ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ

1. Навукова-даследчая дзейнасць студэнта як прафесійная дзейнасць маладога вучонага.
2. Навукова-даследчая дзейнасць, яе віды: інфармацыйна-рэфератыўны, праблемна-рэфератыўны, апісальны і даследчы.
3. Вучэбна-лагічныя ўменні: аналіз і сінтэз, параўнанне, абагульненне і класіфікацыя, вызначэнне паняццяў, доказ і аспрэчванне, вызначэнне і вырашэнне праблем.
4. Агульнанавуковыя метады даследавання: назіранне, параўнанне, падлік (статыстычны метад), эксперымент, абагульненне, індукцыя і дэдукцыя, аналогія, мадэляванне і інш.
5. Метады літаратуразнаўчага даследавання.
6. Агульная характарыстыка асноўных відаў даследчых работ па літаратуры. Навуковы артыкул, рэферат, даклад, праект.
7. Выбар і пастаноўка праблемы даследавання.
8. Абгрунтаванне прадмета і аб’екта даследавання.
9. Фармулёўка праблемы, мэты і задач даследавання.
10. Вылучэнне гіпотэз у навуковых даследаваннях.
11. Дыягнастычны, прагнастычны, арганізацыйны этапы даследчай дзейнасці.
12. Агульная характарыстыка этапаў даследчай дзейнасці.
13. Тэма даследавання, яе віды: інфармацыйна-рэфератыўныя, праблемна-рэфератыўныя, праблемныя, абагульняльныя, даследчыя.
14. Мэта даследавання, патрабаванні да яе.
15. Задачы навуковага даследавання і правілы іх пастаноўкі.
16. Паняцці аб’ект і прадмет даследавання.
17. Крыніцы інфармацыі і іх віды.
18. Алгарытмы вывучэння навуковай літаратуры.
19. Цытаты і правілы іх афармлення.
20. Тэзісы і іх афармленне. Простыя і складаныя, кароткія і разгорнутыя, тэкстуальныя і вольныя тэзісы.
21. Канспект. Віды канспекта – тэкстуальныя, вольныя, змешаныя. Алгарытмы напісання тэзісаў і канспектаў.
22. Кампазіцыя навуковай работы.
23. Уступ, яго прызначэнне і структура.
24. Асноўная частка, яе структура. Віды доказаў. Парадак размяшчэння раздзелаў.
25. Заключэнне. Адпаведнасць колькасці і зместу пунктаў заключэння задачам і зместу самой работы.
26. Спіс выкарыстаных крыніц. Дадаткі, іх віды.
27. Афармленне тытульнага ліста, зместу, спіса выкарыстаных крыніц, спіса ўмоўных скарачэнняў.
28. Афармленне і размяшчэнне дадаткаў; спасылкі на іх у тэксце работы.

29. Навуковы артыкул як лагічна цэльны тэкст, прысвечаны вузкай тэме.

30. Спецыфіка навукова-тэарэтычных, навукова-практычных, гісторыка-навуковых і дыскусійных артыкулаў.

31. Ключавыя словы як пошукавы ключ да артыкула. Індэкс УДК артыкула.

32. Анатацыя як жанр навуковага тэксту. Патрабаванні да анатацыі. Асноўная частка артыкула: спецыфіка структуравання.

33. Уводзіны і заключэнне да артыкула як неад'емныя структурныя элементы, правілы іх напісання.

34. Патрабаванні да аб'ёму і структуры спіса выкарыстаных крыніц.

35. Асноўныя характарыстыкі курсавой работы.

36. Структура курсавой работы і яе афармленне.

37. Асноўныя характарыстыкі дыпломнага даследавання.

38. Структура дыпломнай работы і яе афармленне.

39. Структура і афармленне навуковых публікацый па тэме дыпломнай работы.

40. Прэзентацыя вынікаў навукова-даследчых і навукова-практычных даследаванняў на семінарах і канферэнцыях featuresрознага ўзроўню.

41. Асаблівасці вуснай прэзентацыі акадэмічнага тэксту. Рытарычныя стратэгіі выступлення. Тэмп выступлення, таймінг.

42. Прэзентацыя як візуальная версія выступлення. Аб'ём і структура візуальнай прэзентацыі. Дызайн прэзентацыі.

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ВА ЎСТАНОВАХ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| № | Адзнака | Крытэрыі |
|---|---|---|
| 1. | ***залічана*** | дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне неабходнай навуковай тэрміналогіі, граматны, лагічна правільны адказ на пытанні, уменне рабіць абагульненні і абгрунтаваныя высновы;<br>валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, уменне яго выкарыстоўваць у вырашэнні вучэбных і прафесійных задач;<br>здольнасць самастойна прымяняць тыпавыя рашэнні ў межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>засваенне асноўнай літаратуры, рэкамендаванай вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>уменне арыентавацца ў базавых тэорыях, канцэпцыях і напрамках па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне, модулі і даваць ім параўнальную ацэнку;<br>актыўная самастойная работа на практычных, лабараторных занятках, перыядычны ўдзел у групавых абмеркаваннях, высокі ўзровень культуры выканання заданняў |
| 2. | ***не залічана*** | недастаткова поўны аб'ём ведаў у межах вучэбнай праграмы УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>веданне асобных літаратурных крыніц, рэкамендаваных вучэбнай праграмай УВА па вучэбнай дысцыпліне, модулі;<br>выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, адказ на пытанні з істотнымі, лагічнымі памылкамі;<br>слабое валоданне інструментарыем вучэбнай дысцыпліны, модуля, некампетэнтнасць у рашэнні стандартных (тыповых) задач;<br>няўменне арыентавацца ў асноўных тэорыях, канцэпцыях і накірунках вывучаемай вучэбнай дысцыпліны, модуля;<br>пасіўнасць на практычных і лабараторных занятках, нізкі ўзровень культуры выканання заданняў |

# ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| «Гісторыя беларускай літаратуры мяжы XIX – пачатку XX стагоддзяў» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы 9 «Курсавая работа і дыпломнае даследаванне і патрабаванні да іх афармлення» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Гісторыі беларускай літаратуры мяжы XX – пачатку XXI ст.» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 29.10.2024, Пратакол № 3 |
| «Уводзіны ў літаратуразнаўства» | кафедра беларускай і замежнай літаратуры | Пры вывучэнні тэмы «Методыка напісання навукова-даследчых работ па літаратуры» абапірацца на паняцці, атрыманыя на занятках па «Уводзінах у літаратуразнаўства» | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі. 29.10.2024, Пратакол № 3 |